Цана асобнага нумару 20 гр.

КРАСАВІК

АДНАДНЁЎКА

Вільня, Чацьвер 5-га красавіка 1928 г.

„Anfangs gut, alles gut“ *).

Тое аграмаднае напружаньне, якое перанясьлі беларускія працоўныя гушчы ў часе апошніх выбараў, тая высокая ступень сьпеласьці, якую яны выказалі—калі пры надзвычайных проста абставінах галасавалі навет масава за скасаваныя сьпіскі — ў шмат каго стварыла настрой, што гэтае напружаньне і сьпеласьць мусяць мець прости і пасьлядоўны вынік. Новы Сойм павінен аблягчыць той цяжар, які так балюча адчуваўся асаблівa ў вапошні час.

Слабы, урэшце ўсё-ж акончальны пасьпех „адзінкі“, набіраючы трошкі больш 1/4 галасоў і першыя дні паседжаньняў новага Сойму нібы падцьвярдзілі гэты настрой. Блізка што агульная апазіцыя Сойму проці „адзінай адзінкі“, правам урадовага кандыдата віцэ-прэм'ера Бартля пры выбарах Маршалка, навет словы, сказаныя вызваленцам, што „добры пачатак“—усё гэта без сумляваньня адбілася гучным рэхам па ўсяму краю, уліваючы нібы новую сілу ў людзей, дадаючы новы дух. Ні ў аднаго каго зарадзілася гэтая думка, выказаная нямецкай пагаворкай, што „Anfangs gut, alles gut“.

Ня думаем тут разьбіваць гэтыя, як кажуць, ілюзіі (пустыя надзеі), аднак ні можам і закрапляць іх. Хто пільна сачыў за беларускай радыкальнай прэсаю, той хіба помніць, што яна пісала — выбары ў Сойм ня ёсьць нечым вянчаючым справу, гэта ёсьць адзін з мамэнтаў выяўленьня працоўнымі масамі сваей палітычнай сьпеласьці, ёсьць мамэнт мабілізацыі сьвядомых працоўных сілаў, адным словам, толькі адзін мамэнт (праўда—яркі мамэнт) на шляху да поўнага вызваленьня працоўных масаў. Не накладала вялікіх надзеяў беларуская радыкальная прэса і на новы Сойм, добра ведаючы, у якіх абставінах ён будзе выбіраць ды наагул ня верачы, што Сойм па сваей сутнасьці можа прынясьці запраўдную радыкальную зьмену ў палажэньні працоўных гушчаў. Беларуская радыкальная прэса стала цьвярдзіла, што Сойм ёсьць толькі трыбуна, з якое працоўныя масы могуць таксама чуць і свае шчырае слова, сочучы за якім яны мегуць чуць і бачыць усю фальш і брахню розных прытворных прыяцеляў, як розныя пэпэзсы, стронніцтвы хлопскія (нібы сялянскія партыя), вызваленцы і інш., якія, крычучы голасна аб сваіх дабрадзействах, фактычна зьяўляюцца добрай прыладай у руках буржуазіі для панаваньня над працоўнымі.

Хто яшчэ можа верыць у радыкальную зьмену палажэньня працоўных праз Сойм—хіба—мае добрую навуку з канца старога Сойму ды пачатку новага, калі радыкальных пасол „з месца ў кар'ер“ выносіла з салі мундуровая паліцыя. Трэба хіба наіўным дзецем, каб думаць, што ўзброеная буржуазія дабравольна здасьць свае пазіцыі. Гэта даецца толькі шляхам упорлівай штодзённай барацьбы за свае мінімальныя чалавечыя правы самых працоўных масаў, іх арганізаванасьць, вытрываласьць у барацьбе, іх разуменьне свайго палажэньня.

Пачатак добры—толькі ў адным кірунку: ён паказвае, што навет пры той „выбарнай свабодзе“, якую кожны бачыў, ня ўсё можна зрабіць мацнейшаю сілу, не то працоўныя масы ўсё-ж могуць вітаць сябе з аграмадным (скажам проста) пасьпехам, што яны ўжо прадстаўляюць вялічэзную сілу, з якою прыходзіцца вельмі і вельмі лічыцца. Ня ў тым добры пачатак, што выбраны Дашыньскі, а ня Бартэль (аднаго поля ягады), ня ў той апазіцыі да Ураду, якую праявіў на пачатку новы Сойм, а ў той высокай маральнай сіле працоўных масаў, якія пры такіх надзвычайных абставінах усё-ж правялі сваіх прадстаўнікоў, ды ўрэшце ў маральнай сіле іх праваднікоў—якія ў абліччу арганізаванага ворага сьмела гаворачь голую праўду. Голас, хоць адзін няхай, але ён магутны, бо за сьценамі яго чуюць больш, як галасоў той аграмаднай большасьці, якая, ваюючы між сабой, усе высілкі ўсё-ж зварочвае на вайну з тымі-ж працоўнымі.

Але на гэтым ня „alles gut“, ня „усё яшчэ добра“. Няхай пачатак у Сойме будзе пачаткам і новае — далейшае барацьбы працоўных за свае правы і інтарэсы, а то ўва ўсіх галінах, у якіх хоцьбы дазволена нам канстытуцыяй.

Дык—да арганізацыі! Anfangs gut, alles gut.

*) Пачатак добры, дык і ўсё добра.

Польска-літоўскія перагаворы у Кэнігсбэргу.

30. III. распачаліся ў Кэнігсбэргу (Усх. Прус.) перагаворы паміж Польшчай і Літвой—у справе ўзнаўленьня ўзаемных адносін.

Адчыніў канфэрэнцыю і старшынстваваў у першы дзень літоўскі прэм. Вальдэмарас.

Перагаворы маюць іосьці публічна — у прысутнасьці газэтных карэспандэнтаў, апрача, можа, паасобных мамэнтаў, якія прызнаны будуць дэлегацыямі за сэкрэтныя. Гутаркі ідуць... пафранцуску.

Прамовы старшыняў дэлегацыяў.

Першую прамову сказаў Вальдэмарас, які, падзякаваўшы нямецкім уладам за гасьціннасьць, падчыркнуў важнасьць задачы ўзаемнага паразуменьня, за якую ўзяліся дэлегацыі Польшчы і Літвы: спыніць той „стан няпэўнасьці, у якім усьцяж яшчэ жывуць змучаныя ім цывілізаваныя народы сьвету“. Задачу гэтую адносна Літвы і Польшчы аратар лічыць в. цяжкай. Трэба запраўды на сутнасьці запэўніць мір паміж Польшчай і Літвой—бо-ж адсутнасьць яго ў гэтай частцы Эўропы можа вельмі паважна адбіцца і ў іншых краях. Вось дзеля чаго Ліга Нацыяў, якая пакліканa перадусім да забясьпечаньня сусьветнага міру, з асаблівай увагай займалася заўсёды польска-літоўскім канфліктам. Пасьля спробаў вырашыць гэты польска-літоўскі спор у-ва ўсім яго абыйме, спробаў нажаль ня ўдаўшыхся, Ліга Нацыяў даручыла Літве і Польшчы ўрэгуляваць узаемныя адносіны—у беспасрэдных перагаворах—прыкамся так, каб хаця-б паміж імі забясьпечаны быў мір. „Дык мы начынаем працу дзеля гэтага забясьпечаньня міру, пасьля няўдалых спробаў папярэдніх. Наша сучасная задача значна больш скромная: ня шуканьне канчальнага вырашэньня спору, але імкненьне да прыязных адносінаў паміж абедзьвюма дзяржавамі“. Вальдэмарас верыць у добрую волю абедзьвюх дэлегацыяў—бо-ж гэта—варунак пасьпеху.

Мін. Залескі, таксама падзякаваўшы нямецкім уладам за гасьціннасьць, выказаў радасьць, што ўрэшце бачыць за супольным сталом літоўскую і польскую дэлегацыі. Падчырківае моцна, што польская дэлегацыя прыехала сюды, каб чым хутчэй — згодна з даручэньнем Лігі Нацыяў—узнавіць нармальныя суседзкія адносіны з Літвой.

Польскі міністар таксама верыць, што „дух тых добрых адносін“, аб якіх казала рэзалюцыя Лігі, дый выразам якога зьяўляецца рашучая добрая воля з абодвух бакоў,—давядзе найхутчэй да намысьных рэзультатаў, суадказных жыцьцёвым інтарэсам абодвух краёў. Рэзультатаў гэтых чакае апінія ўсяго сьвету. Дык—хутчэй да дзелавой працы ў камісіях, каб хутчэй супакоіць усіх шчырых прыяцеляў міру ў сьвеце.

На гэтым першае паседжаньне зачынена. Пасьля—началася праца ў створаных камісіях рэчазнаўцаў.

Вальдэмарас ня пусьціў на канфэрэнцыю апазіцыйных карэспандэнтаў.

З Кэнігсбэргу даносяць, што Вальдэмарас ня даў дазволу выехаць з Літвы на канфэрэнцыю рэдактаром апазіцыйных газэтаў, што выклікала вялікае абурэньне сярод апазіцыі.

Нямецкая прэса аб канфэрэнцыі.

Бэрлінская прэса інфармуе аб канфэрэнцыі—без усялякіх тлумачэньняў. Толькі адна з газэтаў (каталіцк. цэнтру) сцьвярджае добрую волю з абодвух бакоў.

Кэнігсбэргскія газэты падчырківаюць, што актыўнай стараной, папіхаючай да рэальных пастановаў, будзе польская дэлегацыя; наадварот — літвіны прыступаюць да цяжкай для іх задачы „з вялікай асьцярожнасьцяй“, якая газэтам выдаецца цалком зразумелай: бо-ж ня так лёгка аддзяліць справы гаспадарчыя і тэхнічныя ад палітычных, зьвязаных з віленскай праблемай.

Камісіі апрацоўваюць падрабязную праграму перагавораў.

На паседжаньнях 30 і 31 сакав. камісіі апрацоўвалі падрабязную праграму перагавораў. Пасьля оканчэньня гэтай працы мае быць пленарнае паседжаньне—для зацьверджаньня праграмы.

Супольны камунікат абедзьвюх дэлегацыяў.

Польская і літоўская дэлегацыі выдалі ўвечар 30. III. супольны камунікат (паведамленьне), у якім сказана, што польская дэлегацыя мае прадставіць літоўскай праекты ўмовы ў справах — прагранічнага руху, паштовай, тэлеграфнай і чыгуначнай камунікацыі, а таксама жаданьні Польшчы ў справе транзыту. З свайго боку, літоўская дэлегацыя выложыць жаданьні Літвы адносна да справы адшкадаваньняў за страты апошняй у зьвязку з наездам на Віленшчыну ген. Жэлігоўскага, а таксама ў справе забясьпечаньня нятыкальнасьці і бясьпечнасьці літоўскай дзяржавы.

Пратэсты з краю, надсыланыя ў Кэнігсбэрг.

Літоўскае афіцыяльнае агенства паведамляе, што Вальдэмарас атрымлівае з Літвы вялікую масу рэзалюцыяў-пратэсту проці ўзнаўленьня нармальных адносін з Польшчай—без папярэдняга вырашэньня віленскай праблемы на карысьць Літвы.

З Сойму.

Ухвала бюджэтнага праекту.

Падаем паводле ПАТ-а паседжаньне Сойму 31-га сакавіка г. г., на якім быў ухвалены бюджэтны праект, дадаючы некаторыя даныя з іншых крыніцаў.

Пры першым чытаньні праекту прамаўляў пасол Чучмай (Сель-Роб правіца), які абвясьціў, што будзе змагацца з „фашыстаўскім тэрорам“. Пасьля яго прамаўляў Вальніцкі (Сель-Роб—лявіца). Вальніцкі пачаў прамову паукраінску, але старшыня Сойму забараніў прамову ў гэтай мове. Выказваецца проці праекту.

Пасол Ладыка асьведчыў, што ўкраінскі клюб будзе змагацца з кожным польскім урадам, які не прызнае незалежнасьці Украіны.

На ўкраінцах прамаўляў Уффа (нямецкі клюб), які асьведчыў, што прызнае за канечнае ўхваленьне бюджэту, без дакладнага яго разгледжаньня, з прычыны браку часу. Пасьля гэтай прамовы, старшыня заявіў, што ўплыла прапазіцыя, аб перарыве ў дыскусіі.

Пас. Сахацкі (камун.) у прамове пратэстуе проці гэтага. У часе яго прамовы падымаецца гоман. Старшыня часова прыпыняе нарады і спыняе дыскусіі. Прадстаўнік Беларускага Клюбу „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“ Я. Гаўрылік, ня гледзячы на дамаганьні, астаецца бяз голасу.

Беларускія і ўкраінскія радыкальныя клюбы дамагаюцца слова, стукаючы па сталох. Гэтым жа часам пачынаецца гоман на лавах камуністаў, сьвіст, гра на розных струмэнтах, што трывае падрад некалькі мінут. Увесь Сойм стаіць анямелы.

За хвілю на камуністаў і беларускіх украінскіх радыкалаў нападаюць пэпэзсы і некалькі паслоў з „адзінкі“ і робяць пасвойму расправу.

Старшыня загадвае маршалкоўскай стражы „ўсунуць“ пас. Сахацкага з салі. Яго выносіць на руках маршалкоўская паліцыя. Наступае 10 мінутовая паўза, па якой стар. Дашыньскі, заяўляе: „Высокі Сойм, дзякуючы пробам пяцёх чалавек стэрарызаваць чатырыста зьлішкам паслоў, пробаў спаняверыць парлямант, як прадстаўніцтва ўсяго народу і спробаў унеможліўленьня нарадаў гэтакімі засобамі (паказвае ўтамабільную сырэну), публічна і ўрачыста абвяшчаю, што кожную такую спробу задушу ў зародку, на падставе дадзенай мне ўлады, (вельмі такі шчыра!). За галасы і ўжываньне гэтакіх інструмэнтаў пасла Гэнрыка Бітнэра і пасла Росяка, выключаю з аднаго паседжаньня Сойму, а паслоў Гаўрыліка (белар. „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“) і Вальніцкага заклікаю да парадку з запісаньнем у пратакол.

Наступна Сойм прыступіў да галасаваньня. Пры галасаваньні адкінуты ўсе папраўкі, апроч папраўкі п. Курыловіча, аб выплаце грашовых дапамогаў дзяржаўным працаўнікам.

Такім парадкам урадавы праект бюджэту быў зацьверджаны Соймам бяз значнай зьмены.

Потым прыступлена да чытаньня ўставы аб надзвычайных дзяржаўных інвэстыцыях (выдатках). Папраўка лявіцы аб адмове крэдыту на будову старостваў і перaказаньні яго на будову школаў, таксама аб вызначэньні на мэльёрацыю—прыймаецца.

———

На наступным паседжаньні гэтага дня Сойм прыступіў да першага чытаньня аб прэлімінарным бюджэце ад 1-га красавіка 1928 г. да 31-га сакавіка 1929 г.

Першы ў дыскусіі прамаўляў пасол Варскі (кам.). Прамову ён пачаў з адчытваньня дэклярацыі свае фракцыі. Старшыня, ня гледзячы на пратэсты, некалькі разоў заклікае прамоўцу, каб ён перастаў чытаць. Прамоўца прыступіў да прамовы, у якой некалькі разоў прабаваў адчытаць дэклярацыю. Старшыня адбірае ў прамоўцы голас. За пас. Варскім, прамаўляў пас. Чапіньскі (П.П.С). Прамова яго мае палемічны характар да папярэдняга. Наступна прамаўляе—пас. Санойца, ад імя Б. Б. С. з Урадам двох гадзіннай прамовай стараецца даказаць канешнасьць ухвалы, але ўся прамова носіць характар арыгінальнай абструкцыі на зацягваньне.

Наступны прамоўца, Хруцкі (Укр.) прапануе адкінуць прэлімінар.

Настае перарыў, у якім віцэ-старшыня Возьніцкі абвяшчае, што ўплылі дзьве прапазіцыі: камуністычнае фракцыі і аналёгічная прапазіцыя п. Хруцкага—адкінуць прэлімінар.

На галасаваньні прапазіцыя адкінута 278 галасамі проці 139.

Бюджэтны прэлімінар адаслана да бюджэтнай камісіі.

Сойм прыступае да наступнага дзеннага парадку: да перагляду папраўкаў Сэнату да ўставы аб надзвычайных дзяржаўных інвэстыцыях (выдатках).

Усе папраўкі Сэнату, якія палягалі ў скасаваньні папярэдніх соймавых паправак: аб вызначэньні на мэльёрацыю на адбудову пачатковых школаў і інш. — Цяпер дзівам прайшлі і ў Сойме. Зноў—ППС-ы „ня мелі часу зьявіцца ў Сойм“.

Такім чынам бюджэтны прэлімінар прайшоў так, як хацеў Урад, без паправак.

Наступаюць наглыя прапазіцыі.

Пасол Багіньскі (Вызв.) падае прапазіцыю аб выбары соймавай сьледчай камісіі, дзеля збаданьня выбараў, якая мела-бы права рабіць досьледы і дапытваць сьведкаў.

„Адзінка“ заклапацілася. Пасол Славэк падыйшоў да віцэ-прэм'ера Бартля і да мін. Медзінскага і нейкі час нараджаліся. Калі пачалі галасаваць, за нагласьць прапазіцыі ўстаў увесь Сойм, ня выключаючы навет і адзінкі, з якой кн. Радзівіл доўга не адважваўся ўстаць.

Наступную прапазіцыю, аб амністыі для палітычных вязьняў падаў віцэ-старшыня Загайкевіч (укр.). Прапазіцыя прайшла 175 галасамі проці 172.

Працэс Сялянска-Работніцкае Грамады.

II-ты дзень працэсу. Гэты дзень зьяўляецца найбольш цікаўным, бо сьведкі, якія закідваюць б. паслу Мятле, а таксама і іншым падсудным „antypaństwową działalność na terenie Zach. Białor." і тварэньне „bojówek", апіраюцца ў большасьці на пагалосках: „чуў ад людзей", на чым праз увесь час апіраўся напрыклад сьведка **Галіцкі,** жыхар з гміны Даўгінаўскай. Чуў, што былі часамі „нелегальныя сходкі", але на пытаньне адв. **Гонігвіля**, што значыць „нелегальная сходка" — адказвае, „ведаю, што былі нелегальныя, бо іх пасадзіла пасьля паліцыя". Вымяняе пасьля Таляронка Кастуся, з вёскі Малажаны і Сыпіляка з вёскі Кліпіца, ад якіх чуў ён аб „Грамадзе".

Падсудны **Талачонак** просіць у судзьдзі голасу і выясьняе, што ён сам паходзіць з вёскі Малажаны, і што „ў нас у Малажанах такога няма".

Упярод гаварыў сьведка, што чуў ад самога Канст. **Таляронка** ўсё, што тычыцца „Грамады", пасьля што ад яго бацькі.

„Чуў ён, што маецца быць паўстаньне, дзеля чаго і маюць быць арганізаваны „баювкі", а на пытаньне адв. **Абрамовіча,** што ён разумее пад „баювкай", дае гумарыстычны адказ: „гэта значыць сарганізавацца да паўстаньня".

Закідае яшчэ падсуднаму б. пас. Мятле, што ён зьбіраў грошы на вязьняў, што ён вёў агітацыю ў Дзісенскім павеце, а таксама ў Докшыцкай гміне; падсуд. **Мятла** выясьняе, што ён быў у Докшыцах усяго адзін раз у 1924 г.

Сьв. Якімовіч кажа, што ён у сьледаваццеля ў Зябках гаварыў няпраўду і што не памятае, што гаварыў. Цяпер паказвае, што чуў ад людзей вёскі **Кухцінцы,** што ў падс. Мятлы адбылася якаясьці сходка (ў гэтай-жа вёсцы), аб зьбіраньні-ж аружжа ня чуў. На сходках ён ня быў ніводнага разу. Падсуд. Мятла выясьняе, што сходкі, пра якую гаворыць сьведка, у яго ня было, а была ёлка (на каляды), на якой былі толькі дзеці, так што не маглі парушацца палітычныя справы.

Сьв. Кураленак: уступіў ён у „Грамаду" ў 1926 г. Відзіўся ён толькі адзін раз з паслом Мятлой і пару раз з Нікіфароўскім. Пас. Мятла пытаўся ў яго, як ідзець арганізацыя і зьбіраў ахвяры на вязьняў.

Сьв. Капуста Міхал. Ведае падсуд. Мятлу, у якога ў Кухцінцах купляў календары, падчас чаго застаў у памешканьні яго нейкіх 3-х асобаў, якія таксама куплялі календары. У справе вайны, або паўстаньня падсудны Мятла не гаварыў нічога, што ў яго ня было ніякіх сходак (ня чуў аб іх), Мятла толькі зазначыў, што: „трэба быць з выведоўцамі (шпікамі) асьцярожна".

Сьв. Міхальскі (капітан К.О.Р.) паказваў пры зачыненых дзьвярох.

Сьв. Савіч (паліцыянт) паказвае, што быў пры канфіскаце 4.000 адозваў у Сэкрэтарыяце Грамады пры Віленскай вул. 12—6, якія распачыналіся ад слоў „Сяляне, Работнікі"...

Сьв. Скулацкі ў восень 1926 г. жыў у сям'е падсуд. Мятлы, з якім некалькі разоў бачыўся. Мятла не намаўляў яго ўступіць у „Грамаду" і ніколі ў гутарцы з ім не парушаў палітычных справ. Бачыў ён, як калісьці Мятла прывозіў якіясьці чырвоныя кніжачкі, якія даваў некаторым з сялян. Падсудны Мятла выясьняе, што гэта былі ўкладаныя кніжкі Віленскага Бел. Кааппер. Банку, якія ён (толькі 5 кніжак) прывёз сялянам, якія запісаліся ў гэты Банк. Паказываець судзьдзя гэту кніжку сьведку, які сьцьвярджае, што „мне здаецца, што я бачыў такія самыя кніжкі".

Прак. Калапскі. У сьледаваццеля гаварыў сьведка аб „выразаньні паноў", што чуў ад Мятлы.

Сьв. Скулацкі: Гаварыў, але была рэпрэсія з боку камэнданта пастарунку Майхроўскага, які са тры разы прыказываў мне так сказаць у сьледаваццеля.

Адв. Абрамовіч. Чаму сьведка жыў у сям'і Мятлы?

Сьв. Скулацкі. Прыехаў на работы.

Адв. Абрамовіч. А ці ня быў сьведка канфідэнтам паліцыі?

Сьв. Скулацкі. Не, але мяне ў гэтым падазравалі.

Адв. Абрамовіч. Ці часта сьведка гаварыў з паліцыяй аб тым, што гаворацць работнікі.

Сьв. Скулацкі. Раз, а то і некалькі разоў у тыдню. (Відаць быў калісьці ў добрых адносінах з паліцыяй, калі яна да яго зьвярталася і даведывалася ад яго, які настрой у рабочых). Сітуацыя выясьняецца і абарона перастае задаваць пытаньні.

Сьв. Яскожыньскі, асьпірант паліцыі ў Лідзе, дае справаздачу разьвіцьця гурткоў у гэтым-жа павеце. Кажа, што хадзілі пагалоскі аб паўстаньні, у якім актыўны ўдзел мелі ўзяць гурткі (наагул паказаньні сьведка апіраюцца пайчасьцей на „хадзілі пагалоскі" „чуў ад людзей", „падслухаў" і г. д.). Быў ён на адной сходцы, дзе маглі быць толькі тыя, якія маюць партыйныя білеты. Падчас гэтага сходу падыйшла да яго адна асоба („jeden z bojówki", як ён кажа), і сказаў яму выйсьці са сходкі.

Адв. Гонігвіль: „І пан, будучы паліцыянтам з аружжам, не заарыштаваў гэтага з „bojówki" і дабравольна выйшаў са сходкі? На гэта асьпірант Яскожыньскі не знаходзіць адказу. Паказвае ён далей, што ў Лідзкім павеце было якіхсь 62 гурткі. Далей, што падчас існаваньня „Грамады" былі залегласьці ў падатках, што тлумачыць агітацыяй „Грамады". На пытаньне адв. Гонігвіля, „ці ёсьць залегласьці падаткаў цяпер", дае адказ „ня ведаю".

Сьв. Шышкевіч, асьпірант паліцыі ў Стаўпецкім пав., расказвае аб дзейнасьці Фабіяна Акінчыца ў Стаўпеччыне, і што Акінчыц быў нібы ў сталым кантакце з Парфімовічам, які, як ён кажа, быў лучнікам паміж „Грамадой" і Менскам. Гэтага сьведка Шышкевіч не гаварыў у сьледаваццеля, дзеля чаго адв. **Гонігвіль** зазначыў: „гэта для падсуднага Акінчыца закід зусім новы, бо не гаварыў сьведка гэтага ў сьледаваццеля, хоць, як афіцэр паліцыі, мусіў сказаць: гэта дае мне сумлеўнасьць", дзеля чаго просіць суд паклікаць на суд Парфімовіча. (Суд пастанавіў даведацца, дзе знаходзіцца, у якім сядзіць вастрозе) і паклікаць яго, як сьведку.

Падсуд. **Акінчыц** заяўляе, што ніякага Парфімовіча ня ведаў і спадзяецца, што суд выясьніць цёмную для яго справу.

Пэўная асоба Абламэйкава пераводзіла людзей, якія ўцякалі з Польшчы ў Савец. Рас. Аднаго разу пераводзіла яна двух нейкіх Будрэйкаў і Трошку ў Расею, якіх заглядзіла гранічная стража, арыштавала аднаго з Будрэйкаў і Гладкага, а другі Будрэйка ўцёк у Расею, якому па пэўным часе ўдалося ўбачыцца з бацькам і сказаў яму, што іх здрадзіў Гладкі. Па пэўным часе была забіта сям'я Гладкіх, а Лявон Будрэйка засуджаны на цяжкую бясрочную катаргу.

Сьв. Наваковскі, камісар паліцыі ў Вільні, расказвае аб дзейнасьці „Грамады" ў месцы Вільні, дзе было 3 гурткі. Грамада, паводле яго паказаньняў, шырыла агітацыю і ў войску, куды пасылалася „бібула" і прамовы камуністычных паслоў: Прыступы і Сахацкага; тры транспарты ў ліку 500 экзэмпляраў яму ўдалося перахапіць. Сьмярша цьвердзіць ён, што атрымліваў гэтую бібулу ад даверанных асобаў Грамады, праз якіх Акінчыц хацеў даставіць яе ў войска, (таксама было паказана і ў сьледаваццеля), а пасьля кажа, што ён даставаў гэтую „бібулу" пасярэдне: ад канфідэнтаў, якія даставалі яе ад асоб трэціх. Пратаколаў ніякіх ня сьпісываў, бо „канфідэнт не згадзіўся-б яго падпісаць"—яго словы.

Бліжэйшых даных на пытаньне абароны: колькі было канфідэнтаў? — ад каго яны атрымлівалі „бібулу"? — колькі ён ім за гэту работу плаціў?—сьведка не падае, затуляючыся „tajemnicą służbową". Усе свае весткі апірае на „obserwacji i konfidentach", якіх не называе.

Аб Каўшу гаворыць, што ён быў „emisarjuszem" савецкім — што ён даведаўся ад адное асобы, якая не хацела, каб ён (Наваковскі) выявіў яго прозьвішча.

Аб Астроўскім мае ён весткі са сьпіску асобаў, які дастаў па ліквідацыі „Грамады". Наваковскі зьяўляецца камісарам паліцыі сьледчай, дзе ўжо 9 гадоў служыць; кваліфікацыі мае 5 кл. гімназіі.

12-ты дзень працэсу з дня 17 га сакавіка. У гэты дзень былі паказаньні адваката Андрэева, які нічога новага ў справу ня ўносіць; іншыя сьведкі паказвалі пры зачыненых дзьвярох.

13-ты дзень працэсу з дня 20-га сакавіка. Сьведкі з гэтага дня даюць паказаньні аб дзейнасьці Грамады ў Дзісенскім, Браслаўскім, Маладэчанскім, Ашмянскім і Вялейскім паветах.

Сьв. Бартошэвіч, заступнік камісара паліцыі ў Дзісеншчыне. Ведае ў справе гурткоў, што яны паўсталі ў канцы 1926 года (нічога новага). У Дзісенскім павеце, па яго словах, вёў арганізацыйную працу быццам пасол **Мятла,** які нібы гаварыў, што партыйны білет служыць пропускам у Расею і што на вясну зьбіраюцца зрабіць паўстаньне—апошняе сьцьвярджае на падставе нібы паказаньня Гаўрыльчыка, якога ён „бадаў" у Празароках.

Прак. Калапскі: Ці раздаваў пасол Мятла камуністычную „бібулу"?

Сьведка: Не памятую.

Далей сьцьвярджае сьведка, што разрухаў з боку гурткоў ня было і што на сходках гурткоў была паліцыя; сам ён з гурткамі ня сутыкаўся.

Сьв. Матусэвіч Казімір, камісар паліцыі Ашмянскага павету, амаль-што праз весь час зазначаецца нязгоднасьць паказаньняў на судзе і ў сьледаваццеля. Гаворыць, што ў павет Ашмянскі прыяжджалі паслы Рак-Міхайлоўскі, Тарашкевіч і Мятла, (у сьледаваццеля казаў, што „найчасьцей быў у Ашмянскім павеце пасол Валошын").

Адв. Бабянскі: у чым выражалася агітацыя гурткоў і ўзбраеньне?

Сьведка падае, што ў сэкрэтара гуртка Бялецкага быў знойдзены „карабін" і яшчэ ў кагосьці рэвольвэр (здаровае прыгатаваньне да паўстаньня!!!).

Падсудны **Валошын** — гдзе і калі быў я ў Ашмянскім пав. — сьведка не знаходзіць адказу.

Далей Валошын выясьняе, што ён у Ашмянскім пав. ня быў ніводнага разу. Таксама і пасол Мятла выясьняе, што ён у Ашмянскім пав. ня быў; быў адзін раз ў Смаргонях у 1924 годзе.

Адв. Бабянскі просіць суд запратаколіць, што сьведка ў сувязі з адным карабінам зьвязывае збраеньне.

Сьв. Карэвіч, былы войт Вялейскай гм., паказвае, што чуў ад сялян сваей гміны, што будзе Беларусь, (судзьдзя—этнаграфічная Беларусь ёсьць і цяпер) — якая пасьля вясеньняга паўстаньня будзе мець сваю ўладу; што будзе з польскай — ня ведае. Былі „залегласьці" падаткаў падчас паўстаньня гурткоў (а цяпер няма?), але пры сьцягваньні іх, грамадоўцы ня ставілі апору.

Быў ён войтам ня з выбараў, але з намінацыі; пры цяперашніх выбарах войтам выбралі другога (мусіць добра насаліў сялянам, што ня выбралі таго самага!).

Перад паўстаньнем „гурткоў", гаворыць сьведка, аб школах беларускіх ня было і мовы, толькі пасьля сяляне пачалі цэлымі масамі прыносіць дэклярацыі з просьбай беларускіх школ, „хоць не здавалі сабе справы, аб што ходзіць" (ну так! сяляне — гэта ж дурні, якія нічога не разумеюць!?).

Сьведкі **Дубоўская і Казімір Флёрэк** на судовую расправу не зьявіліся, прыслалі свае паказаньні на паперы, якія судзьдзя адчытаў.

Сьв. Дабравольскі Уладз (асаднік) быў знаёмы з сям'ёй Рак-Міхайлоўскага, браты якога (нібы) намаўлялі яго ўступіць у Грамаду. Ведае ён, што была якаясьці сходка ў Максімаўцы, аб чым яму гаварыла Ванькоўская. У аднаго з братоў Рак-Міхайлоўскага была калісьці сходка, аб чым ён замэльдаваў тады паліцыю. З Рак-Міхайлоўскім паслом ён ні разу ня бачыўся.

Сьв. Дзяцкі, войт гм. у Радашкавічах, гаворыць ламанай польскай мовай аб тым, што паўстаньне гурткоў было поваддам „залегласьці" падатковай, дзеля чаго ён мусіў наняць сэквэстратара (а цяпер сэквэстратара няма?). Аднак „Грамада" ў Радашкавіцкай гм. была толькі ў 2-х вёсках і не выявіла сваей дзейнасьці: была толькі на паперы.

Сьв. Гутоўскі, земскі камісар у Вялейцы (быў у 1924, 1925 і 1926 г.), дзе праводзілася праца рэгуляцыйная, якая, па яго словах, у 1926 г. пры паўстаньні Грамады вельмі цяжка пасоўвалася. У адной вёсцы Субач, дзе амаль-што аднагалосна згадзіліся на спаленьне, ня вельмі ахвотна давалі работнікаў, а кабеты садзіліся (ў ліку якіх 25) на тое мейсца, дзе ён хацеў ставіць канец, або яго з гэтага месца сьпіхалі, перашкаджаючы такім чынам у працы. Аднак большых эксцэсаў ня было. Сяляне зямлю куплялі ня вельмі ахвотна, ня гледзячы на тое, што даваўся крэдыт (мусіць куплялі-б, каб мелі за што!). Далей падрабязна гаворыць а парцэляцыі, арэндзе і г. д.

Абв. пас. Тарашкевіч. Ці можна было „ўпоўнаважыць" вёскі?

Сьв. так,—вёскі, якія знаходзіліся кругом якогасьці маёнтку.

Яшчэ зазначае сьведка, што камасацыя ёсьць вельмі зложанай справай і пры гэтым заўсёды бываюць незадаваленьні сялян.

Прак. Раўзэ: Ці „Грамада" мела сваіх зямельных камісараў?

Сьв. Аб такіх не памятаю.

Далей падсудны Тарашкевіч пытаецца, ці чуў сьведка (было ў „Кур'еры Віленскім"), што на грунце камасацыі нядаўна адна кабета напалаліла багацейшага гаспадара?

Сьв. Так, чуў. (Адкуль незадаваленьне цяпер, калі няма Грамады?).

Сьв. Брацкі Піліп, рэфэрэнт сьледчы ў камэндзе Маладэчанскага пав., апавядае, што галоўнымі арганізатарамі ў Вялейскім і Маладэчанскім паветах былі Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і Мятла. Весткі свае апірае на „баданях" (бо быў рэфэрэнтам паліцыі) і партыйных білетах; некаторыя асобы, як ён кажа, належалі да Грамады і да К. П. З. Б. як Высоцкі, Жалевіч Мацей, Бандаровіч і іншыя. Далей гаворыць аб камуністычных адозвах, якія былі знойдзены ў ліку 3.000 у Грышэльяна, аб якіх нібы ведае Рак-Міхайлоўскі.

Далей гаворыць аб Мятле, што ён прыяжджаў туды таксама і затрымліваўся ў кааператыве „Zorza"; Мятла выясьняе, што ён прыяжджаў туды ў справах кааператыўных.

У Радашковічах бываў часамі Астроўскі і гасьціў у крэўнай Тарашкевіча Сьніткавай, якой маёнтак знаходзіцца недалёка ад Радашковіч.

Сьведкі — Гнбш, паліцыянт з Браслаўскага павету, Капуцкая Юлія, Малютка і Пашкевіч нічога новага ў справу ня ўносяць.

Сьв. Лукоўскі „przodownik śledczy" кажа, што ў часе ліквідацыі гурткоў аднаго разу праяжджаючы праз вёску Гірды я запытаўся ў аднаго хлапца парасейску: „где комендант"? Той адказаў — якога вам трэба каманданта: беларускага ці польскага? Камэндантам беларускім, як ён кажа, мусіў быць Міхал Сьвечка.

Сьведка **Гэрцог** дае свае паказаньні пры зачыненых дзьвярох.

14-ты дзень працэсу з дня 21 сакавіка 1928 г. У працягу амаль што ўсяго працэсу усе сьведкі, якія зьяўляюцца „funkcjonarjuszami państwowemi", даюць свае паказаньні па-беларуску.

Паказаньні свае ў гэты дзень складаюць першымі былыя грамадаўцы (першыя 6 чалавек), якія цяпер сядзяць у вастрозе (арт. 102 Код. Карн.).

Сьв. Шаўль Міхалай уваходзіць з высока падынятай галавой, а за ім крок наступаець паліцыянт са штыком, наложаным на вінтоўку. Кланяецца былым паслам і ўсім абвінаваченым. Выяўляе сьмела, што ён уступіў у Грамаду дзеля таго, што „гэта партыя найбольш адпавядала маім перакананьням". Да К. П. З. Б. —кажа— не належаў, а калі так сказаў у сьледаваццеля, то толькі таму, „што ён мне сказаў, што Грамада і К.П.З.Б.—гэта тое самае, то я і падпісаўся на пратаколе". З другога боку паказвае, што яго „каталі" некалькі разоў на пастарунку паліцыі Валожыне, „білі прутамі і палкамі" ў экспазытуры. Таксама было „dochodzenie" і ў вастрозе, пры якім „мне разьбілі палкай вусны, на што я маю сьведак".

Сьв. Трус Ян былы грам. сядзіць у вастрозе (са 102 арт. К. К.), пры ўваходзе ў салю кланяецца толькі абвінавачаным паслам. Паказаньні яго на судзе і ў сьледаваццеля нязгодныя. Тлумачыць ён гэта тым, што быў ён „баданы" разы 4 у Валожыне, у Вялейцы разы 3, дзе і „білі" яго „дзеля чаго і мусіў сказаць тое, што яны хацелі". Сходкі ў гуртках адбываліся, але на іх заўсёды знаходзілася паліцыя.

Атрымоўвалі яны таксама і беларускія газэты, як „Наша Справа" „Крыніца", але не дарма, бо выпісывалі іх паасобныя сябры, месячная прэнумарата якіх каштавала $1^1/_2$ зл.

Сьв .Рыжы Аляксандар, былы грамадовец, цяпер сядзіць у вастрозе са 102 арт. К. К. заявае, што быў ён сэкрэтаром Валожынскага гуртка і „стаяў у абароне працоўных". У Цэнтр. Сэкр. у Вільні быў ён толькі 2 разы. За сэкрэтарства атрымоўваў ён 75 зл. у месяц са складак сяброўскіх, бо толькі 25% усіх грошы адсылалася ў Цэнтр. Сэкр. у Вільню. Былі зьбіраныя ахвяры на вязьняў грамадаўцаў, якія былі пасаджаны адміністрацыйным парадкам. Гаворыць далей, што ўсе сходкі, якія рабіліся гурткамі, былі легальнымі, бо мелі дазвол ад старасты і была заўсёды прысутнай паліцыя. Сходак паветовых ня было, але быў ён 2 разы ў Вільні на зьезьдзе.

Адв. Патрусэвіч. — Ці быў на сходцы Астроўскі (у Вільні).

Сьв. — так, гаварыў аб школьніцтве, каб дамагаліся сваіх школаў і які пры гэтым трэба парадак.

Прак. Раўзэ, колькі атрымоўвалі іншыя з прэзыдыуму гуртка?

Сьв.—старшыня 40 зл. і скарбнік 20 зл.

Старшыня суду: якія функцыі былі паветовага камітэту?

Сьв. — езьдзілі па гуртках і тлумачылі праграму Б. С. Р. Грамады.

Судзьдзя Барэйка: — Ці было ў праграме „стварыць самастойную Беларусь"?

Сьв. — Так. Але дарогай эвалюцыі, дарогай арганізацыі.

Пас. Тарашкевіч:—Ці вы думалі аб незалежнасьці, што яна прыдзе адразу?

Сьведка.—Не, што яна будзе з часам.

Далей гаворыць ён, што сяброўскія складкі былі дабравольныя, але кожны мусіў плаціць столькі, колькі ён падпісаў у дэклярацыі.

Сьв. Сабілла Андрэй. — Уваходзячы кланяецца падсудным (сядзіць у вастр. за 102. арт. К. К.) ведае Сідаровіча, які арганізаваў гурткі. „Бадалі" яго ў вялейскім вастрозе,—па яго славах—7 разоў і „гаварыў так, як паліцыя хацела, бо білі".

Сьв. Ліс Ян (з вастр., арт. 102. К. К.). Уступіў у Грамаду ў 1926 г. па ўласнай ахвоце і запытаўшыся Салагуба ў Залесьсі, як трэба арганізаваць гурткі, працаваў у гэтым кірунку. Паміж паказаньнямі цяперашнімі і ў сьледаваццеля выяўляецца супярэчнасьць. Тлумачыць ён гэта тым, што быў баданы ў вялейскім вастрозе ў экспазытуры вельмі многа разоў, дзе за кожным разам

АДОЗВА

Беларускага Пасольскага Клюбу „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў".

СЯЛЯНЕ І РАБОТНІКІ!

Сойм на паседжаньні 31 сакавіка прыняў аднагалосна пастанову аб вызначэньні „Надзвычайнай Камісіі" па прагляду ўсіх надужыцьцяў, якія зроблены ў часе апошніх выбараў. Камісія павінна будзе ў працягу трох месяцаў аб'езьдзіць усе мясцовасьці і пры сьведках дасьлядзіць правільнасьць пратэстаў, якія йдуць з усіх канцоў Польшчы.

Каб справа мела лепшы вынік, Клюб „Змаганьне" зварочваецца з заклікам рабіць пісьменныя акты ўсіх зробленых надужыцьцяў у двох экзэмплярах і адзін з іх пакінуць для падачы камісіі на мясцох, а другі пераслаць у Клюб. Гэта дасьць Клюбу падставу з большым правам дабівацца лепшага прагляду справы і прынясе бязумоўна лепшыя вынікі.

Усе гэтыя акты павінны быць падцьверджаны сьведкамі, а подпісы іх па магчымасьці пасьведчаны належнымі ўладамі (гміна, натарыюс і г. д.).

Апрача таго, Клюб зварачваецца з заклікам прысылаць у канцылярыю Клюбу аб усіх крыўдах, якія Вам робяцца, каб зложыць у Сойме належны ўнёсак ці інтэрпэляцыю.

Часовы адрас канцэлярыі Клюбу: Białoruski Poselski Klub „Zmaganie za interesy włościan i robotników"—Wilno, Wileńska, 12—6.

Беларускі Пасольскі Клюб „Змаганьне".

гаварылі яму, як ён павінен гаварыць — бадаючы ў сьледаваццеля, ня ведаў, што гэта судзьцця і гаварыў тое, што яму сказалі ў экспазытуры, „бо там білі".

Сьв. Магільніцкі Андрэй, вучань 6-ай кл. гімн. зазнае, што да КПЗБ не належыў. Зьявіўся ў Цэнтр. Сэкр. па дазвол для арганізаваньня гурткоў і працаваў у Ваўкавыскім павеце. Ня ведае, ці знаў Цэнтр. Сэкр., што ён есьць вучнем. У Радашковічах яго арыштавалі і засудзілі з арт. 162.

Сьв. Кубарскі, камэндант Браслаўскага павету, гаворыць, што сяляне да часу паўстаньня Грамады адносіліся добра да польскай улады, а нелёяльнасьць праявілася ад часу арганізаваньня гурткоў; сходкі былі часамі нелегальныя, дзеля чаго было арыштавана каля 130 асобаў (Філіповіч засуджаны на 2 гады, Рамансэвіч на 3 г. і г. д.) У Браслаўскім павеце быў Мятла з паслом Шапэлем. У 1926 г. быў Мятла ў Друі, у гатэлі Левіна, дзе адбывалася канфэрэнцыя, на якой Мятла гаварыў, што скора прыдзе зьмена і што рабіў сьпісак асоб, якім меўся памагчы перабрацца праз граніцу — гэтыя паказаньні апірае сьведка на канфідэнцы Глушыне, які адбывае 3-хгадовую кару.

Адв. Гонігзіль: сьведка сказаў, што пас. Мятлой быў зроблены сьпіс асобаў, якія хацелі прайсьці праз граніцу. Нашто было рабіць сьпіс, калі, па словах сьведкі, хапаў партыйны білет?

Сьв. ня можа даць задавальняючага адказу.

Гэты самы Глушын, на якім апіраецца Кубарскі, сьведчыў 29.II, дзе адмовіўся ад таго, што Мятла яму гаварыў аб паўстаньні, эвідэнцыі аружжа і што ён быў канфідэнтам Кубарскага, дзеля чаго быў пастаўлены ізноў перад судом для вочнай стаўкі яго са сьведкай. Цяпер ізноў гаворыць, што ён быў канфідэнтам паліцыі, быў у Вільні, дзе гаварыў з Мятлой, які быццам яму гаварыў, што з паліцыяй трэба быць асьцярожна, бо „яна нарочна правакуе нас, каб мы зрабілі паўстаньне" і г. д. Быў ён канфідэнтам аж да часу арыштаваньня і засуджаны на 3 гады з арт. 129 за „антыпаньствовую" агітацыю ў Грамадзе. Належаў ён да Грамады і быў заўсёды старшынёю на сходках у Едкай гм., дзе адбылося ў працягу 2 х месяцаў 5 сходак. Няпраўду, як ён гаворыць, пры першым паказаньні сказаў дзеля таго, што баяўся палітычных вязьняў, якія яму нібы пагражалі, што „kos na głowę", калі не пакажа так, як яны хочуць. Цяпер просіць ён, каб яго аддзялілі ад гэтых вязьняў.

Пас. Мятла сьцьвярджае, што гэтага чалавека (Глушына) ён ня ведае. „Канфідэнт паліцыі (Глушын) арганізаваў гурткі ў Браслаўскім павеце, які ведама якую мог весьці працу".

Сьв. Здановіч Ян „były przodownik" у сваім часе бадаў таксама ў Глушына, які гаварыў, што мае ад пас. Мятлы інструкцыі ў справе арганізаваньня гурткоў і павятов. камітэту.

Адв. Абрамовіч. Ці Глушын быў канфідэнтам?

Здановіч—ня ведаю, бадаў я яго на „rozkaz" кам. Кубарскага.

Сьв. Буцька „funkcjonarjusz ürzędu śledczego" ў Сьвянцянах, падчас рэвізіі ў Піліпа Кісіна знайшлі каля 3 кіл. выбуховага матар'ялу і некалькі запальнікаў да бомбаў. Далей у справу нічога новага ня ўносіць.

Сьв. Дамарацкі Ян. Уступіў я ў Грамаду, бо мне гаварыў Жданко, што гэта арганізацыя легальная, дазволеная ўладай. Маю я толькі ³/₄ дзесяц. зямлі і многа дзяцей, так што думаў атрымаць якую небудзь пасаду; зямлі дастаць дарма ня думаў. Гурткі будуць выбіраць прадстаўнікоў у гміны, паветы і г. д. Выступіў ён з яе, калі пачуў, што Грамада мае „бальшавіцкі нахіл".

Сьв. Ермаковіч Уладзім. Мае 12 дес. зямлі на 3 братоў. У Грамаду ён ня ўступіў, хоць Пётра Чыкун, старшыня гуртка з вёскі Вір і гаварыў яму, што „як паўстане Беларусь, дадуць яму 4 десяц. зямлей". Гаварыў яму Чыкун яшчэ, што „добра было-б, каб было свая школа". Аб паўстаньні і злучэньні з Саветамі ня чуў.

Сьв. Зановіч Хведар уступіў у 1921 г. ў вёсцы Сінкі ў КПЗБ, ня ведаючы, што гэта што небудзь супольнае з камунізмам. Пасьля „пайшлі мы служыць у войска і ўсё распалася. Цяпер знаходжуся пад дазорам паліцыі. Больш нічога ня ведаю".

Сьв. Жарэк Вац. стар. пшодоўнік на суд не зьявіўся, а прыслаў пісьменае паказаньне.

Сьв. Карнацкі Фр. паліцыянт, гаворыць, што людзі сьпярша ня ведаючы праграмы не арганізаваліся ў Грам., і толькі пасьля ў шыбкім тэмпе пачалі запісывацца ў гэту партыю. Чуў ён аб нейкай міліцыі людовай і выступленьні проці сэквэстратара Васілеўскага.

Абв. Акінчыц:—Ці былі муштры маладых хлапцоў і ці была мова аб складзе аружжа. Сьв.—ня чуў.

Сьв. Малькевіч (з тайнай паліцыі) гаворыць праз дзейнасьць грамады ў Пастаўскім павеце, дзе было каля 100 гур., якія лічылі каля 5.000 асоб. Прыяжжалі ў павет Мятла і Рак-Міх., затрымліваліся ў готэле і да іх прыходзіў „podejrzany" асобнік, з рысапісу якога думае, што гэта быў Бабіч з КПЗБ.

Адзін раз, выходзячы з царквы пасьля адпусту, Хоміч падняўшы чырвоны сьцяг з маладымі зрабіў маніфэстацыю. Пяялі зьмадыфікаваны беларускі гімн.

Абв. Тарашкевіч. Ці сьведка ведае, беларускі нацыян. гімн?

Сьв.—ня ведаю. (Гаворыць аб зьмадыфікаваньні, а ня ведае гімну).

Адв. Прэйс. Ці было ў павятовым камітэце пры вобыску знойдзена што небудзь проці дзяржаўнага?

Сьв.—Ня было.

Адв. Прэйс просіць суд зацягнуць гэта ў пратакол.

З Беларускага Пасольскага Клюбу „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў".

Арганізацыя Клюбу.

Радыкальныя беларускія паслы, прайшоўшыя ў новы Сойм, пастанавілі зрабіць асобны пасольскі клюб, які часова назвалі імем сьпіску Навагрудзкае Акругі—„Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў", ці карацей—Беларускі Клюб „Змаганьне".

У склад яго пакуль-што ўваходзяць паслы: **Гаўрылік Язэп**—старшыня, **Д-р Дварчанін Ігнат**—віцэ старшыня, **Грэцкі Іван**—сэкрэтар і **Стагановіч Аляксандар**—скарбнік.

Аснова працы.

Быць на варце інтарэсаў беларускіх сялян і работнікаў і змагацца за гэтыя інтарэсы ў саюзе з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяў.

Адношаньне да іншых пасольскіх клюбаў.

Пастаноўлена ўвайсьці ў самы цесны кантакт з украінскім клюбам „Сель-Роб—Лявіца" і навязаць па магчымасьці зносіны з блізкімі па духу клюбамі іншых нацыянальнасьцяў.

Першыя дні працы ў Сойме.

Ураз-жа пасьля арганізаваньня Клюб пачаў дамагацца, каб зложыць дэклярацыю, маючую характар праграмы. Затым Клюб прыгатаваў тры ўнёскі: 1) У справе выбарных надужыцьцяў, 2) У справе арышту паслоў у дзень адчыненьня Сойму і 3) У справе спыненьня суда над Грамадой у Вільні.

Дзякуючы сталай адмове ў слове, зложаны і паданы камунікат у прэсу (пастараемся падаць яго ў найбліжэйшым нумары), а таксама разам з украінскім „Сель-Робам—Лявіцай" зрабілі абструкцыю-пратэст, дамагаючыся такім спосабам слова. Пас. Я. Гаўрыліку за гэта была зроблена Маршалкам увага з занясеньнем у пратакол. Іншыя паслы сталіся ахвярай нападу з боку пэпээсаўскіх „герояў", якіх пяшчотныя вушы не маглі вытрымаць „галасу" сялян.-работніц. паслоў.

Праца на далейшы час.

У зьвязку з ухваленьнем унёску аб стварэньне надзвычайнай камісіі для досьледу над выбарнымі надужыцьцямі пастаноўлена зьвярнуцца да беларускіх працоўных гушчаў з заклікам зьбіраць усе матэрыялы выбарных надужыцьцяў з боку адміністрацыі і перасылаць іх у Клюб для перадачы па назначэньню.

У найбліжэйшы час сабраць сходку, на якой апрацаваць больш дакладную праграму дзеяльнасьці.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Капітальныя выдаткі ў праекце бюджэту на 1928—1929 г.

Бюджэт Польшчы на 1928 — 1929 г. прадбачыць у надзвычайных выдатках вельмі значную суму—ў 88 міл. 160 тыс. зл. на капітальныя—пераважна на разбудову ўсялякіх дзяржаўных будынкаў у краі, паміж іншым 1 мільён злот. пойдзе на будаваньне дзяржаўнай друкарні; 10 міл. 300 тыс. зл. пойдзе на будову будынкаў для ваяводзтваў, старастваў, дамкоў для пастарункаў на ўсходнім і заходнім пагранічча дый стражніц для пагранічнікаў; 5 міл. 700 тыс. пойдзе на будову будынкаў мін. скарбу; 12 міл. 200 тыс.—на будову судоў; 14 міл. 170 тыс. пойдзе на будову розных школаў, бібліятэкі, навуковых установ і г.д.; урэшце 44 мільён. 790 тыс. дадзена мае быць у распараджэньне мін. публічных работ — на арганізацыю гэтых апошніх. Шкада, што газэты не падалі пляну гэтых публічных работаў, якія прадбачаны міністэрствам у бюджэце. Можа ёсьць тамака нешта і для нашых шматпакутных „крэсаў", апрача „дамкоў для пастарункаў" і „стражніц для пагранічнікаў".

Крывавыя падаткавыя экзэкуцыі ў Лодзі.

Як падае „Gaz. Warszawska", у Лодзі мелі мейсца досьць паважныя здарэньні паміж не заплаціўшымі падаткі польскімі крамнікамі і сэквэстратарамі скарбовых урадаў. Сэквэстратарам было загадана забіраць тавар у тых, хто ня мог заплаціць. Жыды масава пачалі бараніць свой тавар так, што паліцыя мусіла выслаць да дапамогі ўжо эскорты рэзэрву і часьць коннай паліцыі.

Сэквэстраваныя тавары ўрадоўцы клалі на спэцыяльных вазох, акружаных паліцыяй. На адной з вуліц была спроба адбіць гэтыя „сканфіскаваныя" тавары, чаму перашкодзіла паліцыя; ёсьць некалькі раненых.

„Непаразуменьне" ў Відзэўскай мануфактуры.

У прадзільні Відзэўскае мануфактуры вынікла наступнае „непаразуменьне": фірма адмовіла працу ўсім работніцам, але па двох тыднях пачала зноў іх прыймаць, толькі на абніжаную плату.

За гэтакую „ласку" работніцы запратэставалі італьянскай забастоўкай і зьвярнуліся ў інспэктарыят працы.

„Хіцер Зьміцер, дый Саўка ўжо ня дурны".

Забастоўка браварных работнікаў у Лодзі.

У Лодзі выбухнула забастоўка браварных работнікаў, з поваду жаданьня падвышэньня платы. Забастоўка абхапіла ўсе лодзкія бровары.

Пасол Патэк—аб польска-радавых адносінах.

У Варшаву прыехаў польскі пасол ў Маскве п. Патэк. На канфэрэнцыі з журналістамі пасол гэтак высьветліў сучасны стан польска-радавых адносінаў.

З вялікім сваім усходнім суседам Польшча, з якім яна зьвязана цэлай сеткай інтарэсаў, спараджаецца імкненьне да ўнармаваньня гэтых адносін шляхом розных прыязных умоваў — з карысьцяй для абодвух бакоў.

У гэтым кірунку ідуць і развіваюцца палітычныя адносіны паміж Польшчай і СССР. У сучасны мамэнт у Ленінградзе працуе чыгункавая камісія, якая мае ўнармаваць камунікацыю паміж абодвума краямі. Наагул гаспадарчыя адносіны гэтыя разьвіваюцца стала і паступова. Найважнейшымі задачамі цяпер стаяць перад абодвума краямі—справы заключэньня трактатаў—аб узаемным ненападаньні і гандлёвага. Абедзьве гэтыя справы — зложныя дый нялёгкія. Дык нядзіва, што на шляху да іх вырашэньня—шмат перашкодаў. Але з пасярод іх — пэўне-ж няма немагчымых для перамогі. Дык перагаворы ўсьцяж ідуць, хаця і ня так хутка, як жычылі-б гэтага заінтарэсаваныя староны. Чаму?—Таму, што „бягучыя абставіны жыцьця камплікуюць палажэньне справы. Але трэба мець надзею, што кампліканцыі будуць адсунуты далоў".

Заграніцай.

Пратэст Літвінава проці прамовы старшыні Камісіі разаружэньня.

Выяжджаючы з Жэнэвы, старшыня радавай дэлегацыі Літвінаў зьвярнуўся да старшыні Камісіі Разаружаньня п. Лоўдона з лістам, у якім рашуча пратэстуе проці публічна выражанай апініі апошняга—аб тым, што радавая дэлегацыя — замест таго, каб творча працаваць у паразуменьні з Лігай Нацыяў, выбрала „тактыку зьніштажэньня".

У сваім лісьце Літвінаў заяўляе, што творчай працай на сэсіі камісіі былі толькі прапазіцыі Радаў. У канцы Літвінаў дамагаецца, каб яго ліст быў далучаны да пратаколаў канфэрэнцыі, як афіцыяльнае запярэчэньне заяваў, зробленых публічна старшынёй камісіі.

Англійская Канстытуцыйная камісія ў Індыі.

У канцы мінулага тыдня мела вярнуцца ў Лёндан камісія, высланая англійскім урадам — у мэтах увядзеньня у Індыі канстытуцыі. Камісія складалася выключна з англійцаў, абмінаючы цалком індускіх вучоных і палітыкаў, што адразу выклікала агульны байкот камісіі ўсім сьвядомым насяленьнем краю. На груньце гэтага байкоту, як ведама, пачаліся вельмі няўдалыя рэпрэсіі з боку англійскіх уладаў у краі. Рэпрэсіі з свайго боку выклікалі паглыбленьне ды пашырэньне проціанглійскага руху ў краі. Пачаліся масавыя дэманстрацыі, мітынгі пратэсты і г. д. Не абыйшлося, як водзіцца, і бяз значна вастрэйшых праяваў агульнага настрою індускага грамадзянства проці ўлады, якая ўсьцяж трактуе народ, маючы старую — стовяковую — культуру, як малалетніх, ці дзікароў... Шмат дзе праліліся кроў — з абодвух бакоў. Усё гэта адбывалася некалькі тыдняў таму.

Але вось апошняя тэлеграма з Лёндану кажа, быццам „камісія спакойна закончыла сваю працу — у поўным паразуменьні з індускімі законадаўчымі ўстановамі ды выяжджае ў Лёндан".

З гэтай весткі выходзіла-б, быццам індускае грамадзянства запраўды паразумелася з англійскай уладай, адмовілася ад байкоту камісіі, і ў краі запанавалі мір і цішыня. Але-ж вось зусім апошняя тэлеграма з Калькуты даносіць, што „28.III паміж англійскім войскам і бастуючымі чыгуншчыкамі дайшло да сутычак, у часе якіх забастоўшчыкі — у лічбе некалькі тысячаў — арганізавалі паход пад урадавыя будынкі. Паліцыя і войска адкінулі дэманстрантаў пасьля доўгай барацьбы".

А яшчэ нядаўна тэлеграмы з Індыі паведамлялі аб тым, што ў краі распачаўся сьцяг забастовак—якраз у зьвязку з агульнымі хваляваньнямі ў краі, выкліканымі англійскімі рэпрэсіямі—за байкот камісіі. Дык відаць, у краі зусім ня так спакойна, як паведамляюць з Лёндану.

Радава-афганскі саюз.

Карэсп. „Кур. Варш." піша з Масквы, што радавы ўрад мае запрапанаваць афганскаму каралю фармальны саюз Афганістану з Радамі. Галоўнай часткай саюзнага трактату мае быць ваенная ўмова. Трэба думаць, што тое-ж самае прапануюць Амман-Уллаху і англійцы ў Лёндане. Дык беднаму каралю цяжка будзе выбраць сабе і свайму краю, — з кім і проці каго ім ісьці.

Амэрыканскія „міратворцы" за працай.

Амэрыканскі парлямант прыняў праект марскога міністра—аб асыгнаваньні на разбудову флёту 369 мільён. даляраў.

„Залагоджаньне" адносінаў між Югасавіяй і Італіяй.

Тэлеграма з Вены даносіць, быццам югаслаўскі ўрад згаджаецца ўжо правясьці праз парлямант зацьверджаньне ўмовы, з Італіяй ў Нэттуно. Адначасна мае быць прадоўжаны на далейшыя пяць гадоў „трактат прыязьні" з Італіяй. Такім чынам зпаверху адносіны паміж абодвума нядаўнымі праціўнікамі, амаль не схапіўшыміся толькі што ў крывавай сутычцы, маюць быць „залагоджаны", ці — пафарбаваны ў „мірныя калёры".

Але вось — таго-ж 29 сакавіка тэлеграма з Белграду (Югаславія) кажа, што—„за апошнія дні ў Белградзе пануе вельмі нэрвовы настрой. У палітычных колах упорна шырацца чуткі — аб рыхтаваным і маючым адбыцца ў бліжэйшы час новым рашучым выступленьні на Балканах, якое павінна прывесьці — да разрыву дыплёматычных адносін паміж Югаславіяй і Італіяй...

Вось дык і маеш табе—„залагоджаньне адносінаў".

Румынска-італьянскі канфлікт.

Яшчэ нядаўна—як рымскія, таксама і букарэштскія газэты так рэклямавалі румынска-італьянскую прыязьнь, а румынскі міністар Тытулеску аж 3 тыдні сядзеў у Рыме, гутарачы з Мусоліні, але вось ужо новыя прыяцелі і пасварыліся ды, відаць, надобра.

Як тады заприязьніла, так цяпер пасварыла Румынію з Італіяй тая-ж Вэнгрыя. Тады Мусоліні абяцаў Румыніі націснуць на Вэнгрыю, каб тая прызнала цалком сваю граніцу з Румыніяй, дый гарантавала ёй поўны нэйтралітэт — на выпадак вайны з СССР. А цяпер той-жа Мусоліні—у гутарцы з англійскім адвакатам Вэнгрыі п. Ротэрмэрам—рашуча абяцае падтрымаць Вэнгрыю у яе справядлівых дамаганьнях папраўкі крыўдных граніц, накінутых ёй мірным трактатам, паміж іншым — і граніцы вэнгерска-румынскай.

Дык дзіва, што ў румынскай прэсе пачалася вострая бамбардыроўка проці гутаркі Мусоліні і яго англійскім госьцем. Афіцыяльны орган румынскага ўраду трэбуе вострa, каб Мусоліні запярэчыў таму, што італьянская і вэнгерская прэса падала пад назовам яго гутаркі з п. Ротэрмэрам. Інакш румынская прэса пагражае выступіць ужо проці самога Мусоліні. Апазіцыйная прэса трэбуе ад ураду, каб той даў належны адказ на „гутарку" італьянскага прэм'ера.

Цікаўкая — вестка, паказываючая, як далёка папсаваліся адносіны паміж Румыніяй і Італіяй, кажа, што румынскі міністар Дука спэцыяльна зрабіў візыту польскаму паслу ў Румыніі, каб праз яго прасіць польскі ўрад—адлажыць візыту польскага міністра Залескага ў Рым: бо-ж у час такога вострага канфлікту паміж Румыніяй і Італіяй візыта міністра саюзнай польскай дзяржавы можа тлумачыцца ў Румыніі, як крок няпрыязьні...

Мусоліні канфэруе з англійскім апякуном Вэнгрыі.

Францускай прэса вельмі ўсхваляваная падарожжай вядомага апякуна Вэнгрыі, лёрда Ротэрмэра, англійскага мільярдэра, уласьніка сотні часопісяў,—у Італію—на спатканьне з Мусоліні. Гэты так званы „прэсавы кароль Англіі" даўно ўжо вядзе на сваю ўласную руку зацятую газэтную і дыплёматычную кампанію на карысьць Вэнгрыі, якая праўду кажучы, — больш усіх пацярпела ад прадыхтаванага ёй пераможцамі міру, страціўшы перадусім — больш, як дзьве траціны сваей былой тэрыторыі. Лёрд Ротэрмэр усьцяж агітуе за пераглядам гэтага міравога трактату (так званага Трыянонскага), каб прыймася хоць крыху направіць прычыненыя Вэнгрыі крыўды. Дык паехаў ён на спатканьне з новым саюзьнікам-абаронцам правоў Вэнгрыі, Мусоліні,—якраз у гэтай справе. Абодва вялі ў гэтай справе нейкую гутарку, якая павінна цяпер зьявіцца ў газэтах лёрда Ротэрмэра. Дык дзіва, што палітычныя колы Англіі, а асабліва-ж Францыі—страшэнна занепакоены, ведаючы добра, што Мусоліні „ў выражэньнях не сьцясьняецца". А ведама, што Францыя нічога так не баіцца, як справы перагляду міравых трактатаў наагул. Бо ж, кажуць французы, — толькі дакніся да аднаго з трактатаў, як можа заваліцца ўсесь будынак новай — пасьляваеннай Эўропы.

Але ж і ў самай Вэнгрыі больш цьвярозыя палітыкі ня шмат чаго спадзяюцца па гэтай прыязьні з Мусоліні дый англійскім „прыватным адвакатам Вэнгрыі", лёрдам Ротэрмэрам. Апошнія тэлеграмы з Будапэшту даносяць аб тэй рэзкай крытыцы, якой падала апазіцыя пагранічную палітыку вэнгерскага ўраду (у Вэнгрыі, як шмат дзе інш цяпер, пануе рэакцыйны фашыстаўскі ўрад магнатаў-абшарнікаў)—у часе распачаўшайся бюджэтнай дыскусіі ў парляманьце. Павадыр апазіцыі Рассай закідаў прэм. Бэтлену, што

Вэнгрыя дагэтуль — як была так і ёсьць акружаная варожымі дзяржавамі — М. Антанты, й Аўстрыі, асабліва ж і здаўна ненавідзячай Вэнгрыю Францыяй... Нямеччына захоўваецца здалёка, Англія зусім не падтрымлівае прыватнай акцыі л. Ротэрмэра. Вэнгерскі ўрад не парупіўся аб тым, каб палепшыць хаця крыху гэтыя забойчыя для дзяржавы адносіны. Але за тое здабыў аднаго новага прыяцеля — такую-ж фашыстаўскую Італію. Але гэтая адзіная прыязьнь Мусоліні — толькі пагаршае становішча Вэнгрыі ў сьвеце: падлівае масла ў вагонь француская ненавісьці ды перашкаджае паразуменьню з Югаславіяй. „Перагляд міравога трактату, казаў Рассэй, будзе магчымым толькі тады, калі ўрад кіне палітыку авантураў, на якую, відаць, папіхае Вэнгрыю яе новы прыяцель.

„Дунайская мытная ўнія“.

Ведамы павадыр харвацкай сялянскай партыі, былы рэвалюцыянер-незалежнік, які цяпер пачаў гуляць выдатную роль у палітычным жыцьці Югаславіі, быў навет некальні дзён прэм'ерам, паехаў у Прагу, каб падрыхтаваць тамака грунт для ажыцьцяўленьня сваёй ідэі — стварэньня мытнай уніі дунайскіх дзяржаваў. Ядром уніі зьявіўся-б мытны саюз Югаславіі з Чэха-Славакіяй, да якога пасьля магла б далучыцца рэшта дзяржаваў, для якіх Дунай пасьля вайны зроблены нэйтральным міжнародавым водным шляхом, зьяўляецца найлепшым—натуральным лучнікам у іх гаспадарчым аб'яднаньні.

Паварот да нармальнага жыцьця.

У сэнацкай камісіі Чэха-славацкі ўрад заявіў, што Чэха-Славакія мае намер скасаваць пашпартныя візы (асобныя дакуманты дазволу на ўезд) з Англіяй, Польшчай, Швэцыяй, Фінляндыяй і Галяндыяй.

Сэнсацыйная заява павадыра румынскай апазіцыі.

Павадыр румынскай „нацыянальна-сялянскай партыі“ Маніў, які усьцяж вядзе барацьбу з „лібэральным“ урадам за ўладу, заявіў журналістам, што—у чэрвені ён і яго партыя будзе ўжо трымаць уладу ў сваіх руках.

З свайго боку павадыр „лібэралаў“, прэм. Братыяну толькі што ў вялікай прамове заявіў, што ўрад ня думае навет уступаць мейсца апазіцыі. Наадварот, урад будзе весьці з ёй бязьлітасна барацьбу, як з здраднікамі дзяржавы, дадаўшы, што — „ён мае бясспрэчныя доказы таго, што „сялянская партыя атрымлівае грошы з Масквы“. Ці запраўды так ужо шмат гэтых грошаў у Маскве, ці гэта—так сабе добры—бо-ж агульна прыняты цяпер—звычай, а перадусім—лёгкі спосаб барацьбы з супраціўнікамі—ня ведаем.

Аддзяленьне рэлігіі ад дзяржавы ў Турцыі.

Турэцкі міністар справядлівасьці заявіў,—у прамове аб праекце аддзяленьня рэлігіі ад гасударства — што прынцып гэтага аддзяленьня ня мае нічога супольнага з акцыяй проці рэлігіі. Гэтая рэформа вымагаецца толькі прынцыпам сьвецкасьці ды скасаваньня ўсялякага клерыкалізму, які прыняты маладой турэцкай рэспублікай. Дзеля таго новы праект касуе ведамы арт. 2 турэцкай канстытуцыі, які абвяшчае мусульманскую рэлігію, як „веру турэцкага ўраду“, пануючай у дзяржаве.

Шпарка адганяе Турцыя некаторыя эўрапейскія дзяржавы, якія „гоняць“ назад — да XVII веку.

Нямецкі сацыяліст—аб пераглядзе граніцы з Польшчай.

У Бэрліне адзін з галоўных павадыроў нямецкай сацыял-дэмакратыі, адзін з гарачых прыхільнікаў польска-нямецкага паразуменьня, пасол Брэйтшэйд прачытаў даклад—аб загранічнай палітыцы сучаснага нямецкага ўраду. Дакладчык востра закідаў нямецкім нацыяналістам тое, што яны найбольш псуюць нямецкаму народу яго жаданьні мірнага паразуменьня з усімі суседзямі. Дык задачай новага ўраду, які будзе створаны новым, больш дэмакратычным і радыкальным Соймам, мае быць перадусім паразуменьне Нямеччыны з Францыяй, ад якога залежыць галоўным чынам мір у Эўропе. Але таксама і на Усходзе Нямеччына павінна весьці мірную палітыку. Але-ж вось, заявіў пас. Брэйтшэйд, на шляху гэтай палітыкі ляжыць бервяном справа новых крыўдных для Нямеччыны ўсходніх яе граніцаў, якіх ня можа прызнаць нямецкі народ. Дзеля таго—кожны нямецкі ўрад павінен будзе дамагацца перагляду ды папраўкі гэтых граніцаў. Зразумела, аднак-жа, што шлях гэтага перагляду павінен быць вылучна мірны, — без тасаваньня якога-небудзь гвалту. Спорную справу трэба здолець вырашыць спосабам узаемнага паразуменьня.

Нямеччына будуе браняносец проці Польшчы.

Парлямант прыняў — проці галасоў камуністаў, сацыялістаў і дэмакратаў — марскі бюджэт, у якім прадбачана будова аднаго браняносца. Проці гэтага крэдыту вялася апошні час гарачая кампанія ў радыкальнай прэсе, даводзіўшай, што сіла Нямеччыны — не на моры дый ня ў яе ваеннай моцы, дый вымагаўшай больш прадукцыйнага выкарыстаньня трох мільёнаў, якія марскі міністар хоча выкінуць на браняносец. Абаронцы нямецкага флёту казалі на гэта, што Нямеччына павінна выкарыстаць усё тое, што дазволена ёй Вэрсальскім Трактатам, які дае права немцам мець 4 браняносцы.—Дык ня трэба немцам быць менш заброеным, чым гэта дазваляе Трактат. Найцікаўнейшым было выступленьне ў Сойме прадстаўніка „нямецкай народнай партыі“ адмірала Брюнінггаўза, які даводзіў канечнасьць для Нямеччыны мець хаця-б такі сільны флёт, які-б мог прынамся забясьпечыць яе ад імкненьняў і прэтэнзіяў Польшчы, якая ўжо залішне яўна пагражае незалежнасьці Гданску, разбудоўваючы ўласны порт у Гдыні...

Літоўскі ўрад рыхтуе „рахунак“ Польшчы за ген. Жэлігоўскага.

У апошнія дні перад перагаворамі ў Кэнігсбэргу літоўскі ўрад сьпешна заняўся падлічэньнем стратаў, якіх нарабіў Літве напад на Віленшчыну генарала Жэлігоўскага. Пакуль-што Вальдэмарас налічыў стратаў на 3 мін. літаў. Падрабязны рахунак стратаў мае быць прадстаўлены польскай дэлегацыі ў Кэнігсбэргу агулам на 10 мільёнаў дал.

Літоўская прэса наагул вельмі скэптычна глядзіць на перагаворы, лічучы за магчымасьць іх хуткага перарыву, калі не разрыву. Бо-ж прызнаньне сучасных граніц было б для Літвы вялікім паражэньнем, а ўсялякая ўмова аб узнаўленьні адносін — пры існуючым палажэньні—была-б ускосным прызнаньнем гэтага палажэньня рэчаў.

Газ. „Сегодня“ (ў Рызе) даведалася ў Коўні, бытцам польска-літоўская канфэрэнцыя ў Кэнігсбэргу праціўжыцца толькі 3 дні дый апрацуе толькі праграму перагавораў. А гэтая праграма будзе разглядацца толькі пасьля Вялікадня — на новай канфэрэнцыі, можа і ня ў Кэнігсбэргу. Нямецкая і літоўская прэса падчырківае сільна, што пасьпех перагавораў залежыць цалком ад Польшчы— ад тых уступак, на якія пойдзе польская дэлегацыя.

Таварная камунікацыя паміж Польшчай і СССР.

27.III адбылося ўрачыстае адчыненьне беспасрэднай (без перагрузкі) таварнай камунікацыі паміж польскімі і радавымі чыгункамі. Таварны чыгункавы рух будзе ісьці праз дзьве станцыі: Негарэлае і Здолбунава. Дзеля таго, што шырыня польскай і радавай калеі розная, у вагонах на паказаных станцыях замяняюцца восі. Замена восяў займае некалькі мінутаў, тады як перагрузка патрабуе ня менш 5 гадзін. У сучасны момэнт тэхнічныя прылады на станцыях даюць магчымасьць прапускаць у абодва канцы толькі па 15 вагонаў у дзень, але ў хуткім часе лічба вагонаў, праходзячых праз пагранічныя станцыі, мае быць даведзена да 150 на кожнай (па 75 у кожны бок). Можна спадзявацца, што ўсё гэта значна ажывіць таварны рух паміж Польшчай і СССР.

Выбары ў Францыі.

Выбары ў парлямант назначаны на 22 красавіка. Выбарная кампанія — у поўным разгары. На першым пасяджэньні выбарчай камісіі Парыжскага вокругу запісалася аж 200 кандыдатаў. Гэта сьведчыць аб значным партыйным распыленьні будучага парляманту.

Наша хроніка.

Агульны Сход Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні. 2 красавіка адбыўся агульны сход Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні.

На старшыню быў абраны гр. сэн. Багдановіч, віцэ-старшынёй былі гр. гр. дыр. Паўловіч і Сіняўскі,—сэкрэтарамі гр. гр. Кэпэль і Мароз.

На сходзе быў прысутны рэвідэнт з „Rady Spółdzielczej“ гр. Ботта.

Пасьля справаздачы Управы і Наглядная Рады Банку і прыняцьця абсолюторыуму для Управы і Нагл. Рады былі давыбраны сябры Наглядная Рады: гр. гр. Пяткевіч і Кэпэль і заступнікамі: гр. гр. Грышкевіч, Марцінчык і Міхалевіч.

Падрабязная справаздача аб сходзе будзе дадзена ў адным з найбліжэйшых нумароў газэты.

1.700 проціадміністрацыйных праступкаў. На падставе паліцыйных рапартаў, у мінулым сакавіку ў Вільні пацягнута да карнай адказнасьці 1.700 асобаў за розныя проціадміністрацыйныя праступкі.

Як бачым, Вільня ня сьпіць у шапку— некаму ёсьць чым пахваліцца.

Плата пэнсіяў праваслаўнаму духавенству. Ад 1 красавіка гэтага году адміністрацыйныя ўлады 1 інстанцыі маюць выплачываць пэнсіі праваслаўным сьвяшчэньнікам.

Велічыня пэнсіі залежыць ад даходнасьці парафіі.

Ці не заплата гэта за падтрыманьне адзінкі ў выбарнай кампаніі?

Пашпарты для коней. Есьць пэўныя пагалоскі, што ў хуткім часе на абшарах віленскага ваяводзтва будзе перагляд коней.

Адносныя ўлады праектуюць выдаць па заходня-эўрапэйскаму ўзору пашпарты ўсім коням, старэйшым 4 гадоў, дзякуючы чаму мае абніжыцца крадзеж коней.

Ухіляньне ад рэестрацыі коней — будзе карацца.

Арышт б. заступніка кам. паліцыі Віленска-Троцкага павету. Абшарніцкае „Słowo“ падае, што ў Вільні арыштаваны былі падкамісар і заступнік павятовага каманданта паліцыі на Віленска-Троцкі павет. пан Л. Арышт зьвязаны з уяўненьнем сфальшаваньня дакуманту, якое даканаў у свой час арыштаваны. Гэтае сфальшаваньне злучаецца з (па славах „Słowa“) з адным з найвялікшых крымінальных актаў, зьліквідаваным на правіцы.

Арыштаванага пасадзілі ў турму на Лукішкі.

„Не адным толькі беларусам ня можна заракацца турмы, хоць і не за гэтакую „ганаровую“ справу“.

З Горадзеншчыны. На зьездзе павятовых земскіх камісараў у Горадні ваявода Кіршт запытаў, чаму ў горадзенскім і ваўкавыскім павеце „парцэляцыя“ адбываецца „стасункова слаба“.

Рэфэрэнты адказалі, што народ чакае на бясплатную парцэляцыю.

Цікава — як яны гэта асьмеліліся сказаць.

Таемнае забойства. Каля вёскі Лыкавічы, Стаўпецкага павету, затрымана каня з санямі, на якіх знаходзіўся труп забітага чалавека.

Забітым аказаўся дробны гандляр скацінай жыхар м-ка Турца, Ісаак Нейневіч.

Забіты рэвальвэравым стрэлам у галаву. Дамысьляная прычына забойства — асабістая помста, бо пры забітым знойдзены грошы, а на возе цялята і другія „спажывецкія артыкулы“.

Можа й ён, як з аднае воласьці з Гурыпам, „дужа чаго ведаў аб „Грамадзе“, дык і яго „забіла“ даўно ўжо забітая „Грамада“.

Падзяка.

Слонімская акр. управа Т-ва Бел. Школ. шчыра дзякуе грамадзянам, ахвяраваўшым ахвяры на карысьць Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы для беларускіх гімназіяў. За немагчымасьцю зьмясьціць імёны ўсіх ахвярадаўцаў падаем да ведама толькі назоў вёсак:

Казлоўская вол. 1. Харабровічы—4 зл.; 2. Петрашукевічы—29 зл. 40 гр.; 3. Малдавічы—3 зл. 90 гр.; 4. Скіпоравічы—8 зл. 90 гр.; 5. Даўбкевічы—22 зл. 50 гр.; 6. Міхашевічы—13 зл. 27 гр. Разам—81 зл. 97 гр.

Кастравіцкая вол. 1. Едначы — 24 зл. 50 гр.; 2. Голі—11 зл. 55 гр.; 3. Ламашы — 15 зл. 35 гр.; 4. Лыскі — 26 зл. 75 гр.; 5. Сенькаўшчына—17 зл. 70 гр.; 6. Куцэўкі — 17 зл. 80 гр.; 7. Кастравічы—4 зл. 50 гр.; 8. Бардавічы—2 зл. 60 гр. Разам—120 зл. 75 гр.

Старавеская вол. 1. Х. х. Вострава і Мошкі—60 зл. 50 гр.; 2. в. Дуброўка—3 зл. 05 гр.; 3. Клімавічы—85 зл. 70 гр.; 4. Вострава—44 зл. 15 гр. Разам — 195 зл. 40 гр.

Масілавічы, Дзявяткаўскай вол.—20 зл.; Чапялёва, Шылавіцкае вол. — 21 зл. 50 гр.; Мыслава, Міжавіцкае вол.—4 зл. 41 гр.

Усяго — 442 зл. 03 гр.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Голас з вёскі.

Да грамадзян Зах. Беларусі.

Кожны грамадзянін-беларус, а асабліва сябра Т-ва Беларускае Школы, перш за ўсё павінен дбаць аб асьвеце свайго народу. Калі ўсе іншыя народы маюць сотні ці навет тысячы сярэдніх і вышэйшых культурных установаў, ці то гаспадарственых (панствовых), ці то прыватных, мы ў гэтым адносіньні лічымся самымі беднымі. Ня маем ня толькі вышэйшых, ці сярэдніх (апрача чатырох беларускіх гімназіяў), але і пачатковых школ, бо некалькі штук ёсьць утраквістычных (мешаных польска-беларускіх) школ—, гэта надта нявялікая лічба на ўсю Заходнюю Беларусь. Адзіная наша культурная ўстанова, Т-ва Беларускае Школы, знаходзіцца ў цяжкім становішчы. Прычына гэтага брак сродкаў і брак сьвядомых працаўнікоў. Дык, грамадзяне! Усе як адзін,— каму дарагая беларуская народная справа, каму дарагая ягоная культура, хто хоча ўбачыць хвіліну яго расквіту—да працы, да падтрыманьня свае культурнае ўстановы, як маральна, так і матэр'яльна!

Сябры Т-ва павінны памагчымасьці акуратна ўнасіць сяброўскую складку, а рэшта Грамадзянства павінна, бо гэта наш грамадзкі абавязак, складаць пасільныя ахвяры, каб гэтым даць магчымасьць Т-ву выпаўніць высокія заданьні, заданьні асьветы нашага народу.

Апрача гэтага, заклікаем да актыўнае культурнае працы сяброў Т-ва на мясцох: Закладайце Народныя Дамы, бібліятэкі-чытальні. Прывядзеце ў належны парадак ужо існуючыя. Выкарыстоўвайце мясцовыя сілы для читаньня лекцыяў, для арганізацыі хораў, каапэратываў і г. д.

Памятайце, што ад Вашае дапамогі і працы залежыць будучыня Беларускага Народнага Адраджэньня. Культурнік.

Культурна-асьветная праца ў вёсцы.

(З Баранавіцкага павету).

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў в. Кудзевічах на Каляды 9 студня г. г. наладзіў спэктакль-вечарыну. Многа сялян прыйшла з розных суседніх вёсак, але толькі частка іх (сялян, 90 асоб) магла зьмясьціцца ў салі нявялікае сялянскае хаты. Сярод глядзельнікаў—працоўных вёсак бедна, але чыста апранутых, звярачалі ўвагу блішчастыя „мундзіры“ двох прадстаўнікоў улады. На сцэне, вельмі добра збудаванай групай найбольш актыўных працаўнікоў Гуртка, былі згуляны:

1) „Зьбянтэжаны Саўка“. Л. Родзевіча. Дзеючыя асобы: Саўка—грам. Кастусь Галубовіч, Магрэта—гр. Ганна Губейка і Жабрак— гр. Мітрафан Бакач.

2) „Стараста“ жарт у 1 дзеі Л. Родзевіча. У ролі старасты — грам. Мітрафан Бакач,—Мікіты Бульбаткі—грам. Лявон Бакач, у ролі Кандрата — грам. Апанас Бакач і чатырох сялян.

3) Прадэклямаваны вершы: „Асадзі назад!..“ Я. Коласа — гр. Кастусь Галубовіч, „Родныя абразы“ Я. Купалы — гр. Ганна Комар, „Я хацеў бы“... Я. Купалы—грам. Мікалай Бакач, „Вол і авадзень“ (Маланка) — грам. Лаўрук Бондар і „Мая думка“ Я, Купалы—грам. Сьцяпан Шэйна.

4) Грамадз. Ганна Губейка прапяяла народную песьню: „Каліна“.

5) Скокі, якія трывалі да гадз. 2 ўночы.

Перад вачыма глядзельнікаў прайшоў цэлы рад жывых абразкоў з вясковага жыцьця, добра знаёмага аўтару п'есы „Зьбянтэжаны Саўка“. Спэцыфічны характар вясковае сваркі, бязраднае палажэньне Саўкі ў ролі гаспадыні выявіла стольні здаровага гумару, што нельга было не сьмяяцца. Прыгожая маладая дзяўчына Ганна Губейка з вялікім пачуцьцём пяяла „Каліну“. Ад гэтай песьні, наадварот, павеяла смуткам нашага гаротнага жыцьця, прадуктам каторага зьяўляюцца сумныя мэлёдыі народных песьняў...

Прысутныя на спэктаклю-вечарыне засталіся вельмі здаволены. А дзеля гэтага Гурток у хуткім часе прыступіць да прыгатаваньня да пастаноўкі новага спэктаклю.

Не магу ўстрымацца, каб ня выразіць свайго шчырага здаваленьня па прычыне уваходу нашага Гуртка Т-ва Б. Шк. ў рамкі нармальнага жыцьця. Яшчэ год таму назад ён распачаў культурна-асьветную працу пры вельмі цяжкіх абставінах: розныя перашкоды з боку ўлады, адсутнасьць матар'яльнага і маральнага падтрыманьня, шкодная агітацыя несьвядомых элемэнтаў сярод такіх-жа несьвядомых сялян і г. д. — усё гэта не давала магчымасьці ажыцьцявіць трудныя заданьні Гуртка. Цяпер жа каля Гуртка стварылася невялікая група больш-менш інтэлектуальна разьвітых людзей, якая паставіла перад сабой заданьне: з новай энэргіяй уступіць у барацьбу з акружаючай цемрай, кінуць у глыбіню гэнае цемры промень сьвятла культуры... У добры час!

Кастусь Галубовіч.

Грамадзяне—пчаляры!

У нашых ціхіх яшчэ звонку вульлях пачынаецца ўжо новае жыцьцё. Чуючы блізкую вясну, матка кладзе яечкі—творыць новыя пакаленьні, новую моцную маладую сям'ю.

Трэба каб з гэтай вясною і мы выйшлі да працы каля нашых пчолак не адзінкамі, часта бяссільнымі пры напатканых труднасьцях, а згуртаванымі ў адну моцную сям'ю ў Беларускае Каапэратыўнае Таварыства „Пчала“.

У Т-ве „Пчала“—мы купім усе неабходныя для нашай пчалярскай гаспадаркі матэр'ялы і прылады.

Праз Т-ва „Пчалу“ — прадамо свой мёд і воск па найтаньнейшай цане.

У Т-ве „Пчала“ — зможам атрымаць пазыку, неабходную для надзяцьця нашай пчалярскай гаспадаркі.

У Т-ве „Пчала“—мы атрымаем ўсялякія парады, інфармацыі; даведаемся аб усялякіх новых вынаходах і палепшаньнях, якія зьявіліся ў апошнія часы, як у краі, так і заграніцай.

Т-ва „Пчала“ — паможа нам паставіць нашыя гаспадаркі на культурны ровень і атрымаць з іх магчыма вялікія матар'яльныя карысьці.

Дык запісвайцеся ў сваё каапэратыўнае Т-ва „Пчала“!..

Сябрам Т-ва можа быць кожны, хто мае праўную здольнасьць браць на сябе забавязаньне. Сяброўскі пай—10 злотых. Упісовых— 2 злотых.

Ня гледзячы на тое, што Статут Т-ва будзе зацьверджаны толькі ў палове красавіка, і тады зможам прыступіць да афіцыяльнай працы, не пакладайма рук ужо і цяпер. Запісывайцеся ў сябры Т-ва, агітуйце сярод пчаляроў нашай ваколіцы, каб у красавіку вялікай сям'ёй прыступіць да працы і вясьці яе на карысьць нашага пчалярства, а тым самы на карысьць нашай Бацькаўшчыны—Беларусі.

УПРАВА.

Выдавец: М. Гэрмановіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.